## АДЧАЙ

### З успамінаў А. Лукашыка, в. Вараны

Была другая нядзеля пасля прыходу немцаў. Стаяў цёплы і сонечны ліпеньскі дзень. Я з сябрамі гуляў на вуліцы ў свае няхітрыя дзіцячыя гульні, калі пачулася вуркатанне аўтамабіляў. Аўтамабілі мы тады бачылі нячаста, а нямецкія ўвогуле толькі ў дзень прыходу немцаў, а таму пабеглі ў канец вёскі, каб паглядзець, што там робіцца. Па дарозе, якая праходзіла міма нашай вёскі Вараны ад Збораў на Стары Дворац, набліжалася нямецкая калона. Калі пярэднія машыны ўжо выходзілі на выган, праз які праходзіла дарога, з жыта, што расло за выганам, выйшаў малады чалавек. Быў ён без галаўнога ўбору, у цывільным пінжаку, але ў чырвонаармейскіх гімнасцёрцы і нагавіцах. Некалькі хвілін ён глядзеў на немцаў і па баках, а потым сеў на брук, якім быў агароджаны выган. Ад дарогі да бруку было каля ста пяцідзесяці метраў. Немцы на сядзеўшага нібыта і не звярталі ўвагі. Яны больш глядзелі ў процілеглы бок - на вёску. Калона ішла сваёй дарогай, а чалавек сядзеў і глядзеў на яе. Вось з ім параўналася ўжо і пайшла далей апошняя машына. Здавалася, што гэтым усё і скончыцца. Але раптам машына спынілася. У кузаве падняўся немец з аўтаматам і нешта закрычаў і прызыўна замахаў рукой да сядзеўшага. Той падняў угору рукі, устаў і пайшоў, а потым пад крыкі немцаў «Шнэль! Шнэль!» падбег да машыны. Калі ён дабег да яе, паміж немцамі і ім адбылася кароткая размова. Зместу яе мы не чулі, бо ад нас да іх было метраў сто.

Літаральна праз некалькі хвілін машына скранулася з месца, а чалавек з паднятымі ўгору рукамі і пад наведзенымі на яго аўтаматамі пабег услед за ёю.

Праўда, на яго шчасце, дарога хоць і называлася гасцінцам, але на ёй было многа калдобін, глыбокіх каляін ад вазоў, а таксама камянёў, што валяліся асобна. І машыны па ёй рухаліся з хуткасцю 15-20 кіламетраў у гадзіну. Колькі мы бачылі - чалавек бег за машынай.

Здавалася б, нічога асаблівага не здарылася. Чалавек здаўся у палон. На вайне бывала і куды больш страшнае, горшае.

І ўсё ж... Усё ж гэты выпадак мне так яскрава запомніўся, так урэзаўся ў маю дзіцячую памяць, што я яго помню так, нібыта гэта было нядаўна, а не больш пяцідзесяці гадоў таму назад. Мабыць, гэта таму, што ён прымушае задумацца аб паводзінах чалавека і чалавечым лёсе ўвогуле.

Аб тым чалавеку я абсалютна нічога не ведаю. Невядома дзе, як і пры якіх абставінах ён разлучыўся са сваімі баявымі сябрамі. Магчыма, яны загінулі ў баі. Магчыма, гэта здарылася выпадкова ў гарачцы бою і адступлення. Магчыма, ён свядома ўцёк ці адстаў ад іх, каб выратаваць сваё жыццё, ці проста са страху. Усё можа быць.

Я не схільны лічыць яго здраднікам. Ужо тое, што ён не дзень і не два блукаў у тыле ў немцаў і быў у цывільным пінжаку сведчыць аб тым, што ён першапачаткова думаў не аб палоне, а аб тым, як прабіцца на Усход да сваіх

ці дачакацца вяртання Чырвонай Арміі. Невядома, што перажыў і перадумаў ён за час вайны і свайго блукання ў тыле немцаў. Але, бяспрэчна, што перажыў і перадумаў многа, што ім авалодоў адчай, таму што толькі ў адчаі чалавек можа здацца на волю лёсу, як гэта зрабіў ён.

Невядома, колькі яму давялося тады бегчы за машынай. Ці дажыў ён да канца вайны? Ці дачакаліся яго дамоў родныя і блізкія? Але думаю, што, калі ён бег за машынай з паднятымі ўгору рукамі і пад наведзенымі на яго аўтаматамі немцаў, то ім авалодаў яшчэ большы адчай, што ён сам сябе ненавідзеў і праклінаў за тое, што змаладушнічаў і здаўся на волю лёсу замест таго, каб да канца выкарыстаць усе магчымасці змагацца за сваё жыццё, за свой лёс, за сваю будучыню.

А. Сухоцкі, в. Вараны,
1994 год.